**М.А.Бяспалая,**
*прафесар*

# РАЗНАСТАЙНАСЦЬ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАГА ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСІ НА ПАМЕЖЖЫ XIX—XX стст.

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі ў азначаны перыяд у складзе Расійскай імперыі па многіх прычынах мела свае адметнасці. Перш за ўсё адзначым абуджэнне нацыянальнага пачуцця і фарміраванне адпаведнай плыні, дзеячы якой актыўна пашыралі ідэі беларускага адраджэння сярод насельніцтва. Нельга не заўважыць, што адукаваныя колы беларускага грамадства, у тым ліку памешчыкі, чыноўнікі, духавенства, інтэлігенцыя, таксама разумелі неабходнасць далучэння жыхароў вёсак, мястэчак і гарадоў да асветы. Многія з іх заставаліся абыякавымі да беларускага адраджэння, аднак іх культурна-асветніцкая дзейнасць аб'ектыўна ўплывала на неадукаваную масу, што, безумоўна, станоўча ўздзейнічала на развіццё грамадства ў цэлым.

Згодна перапісу 1897 г., у Беларусі працавалі 54 368 прадстаўнікоў інтэлігенцыі [1, с. 25], да якіх адносіліся ўрачы, адвакаты, настаўнікі, інжынеры і інш. Як бачна, інтэлігенцыя складала дастаткова шматлікую групу і магла прыметна ўплываць на існуючую рэальнасць. А яна патрабавала значных высілкаў усіх спачуваючых, каб выправіць становішча. У якасці ілюстрацыі нагадаем сведчанне настаўніка Магільнянскага народнага вучылішча, запісанае ў 1889 г.: "У мястэчку Магільнае так моцна развіта п'янства, што злачынствам не лічыцца. П'юць не толькі дарослыя, але і дзеці..." Назіранні настаўніка пацвярджае адзін з членаў Таварыства народнай цвярозасці: "Нідзе так не распаўсюджана п'янства, як у нашай краіне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія гады пачынаюць піць нават жанчыны і дзяўчаты, а дзеці і падлеткі напіваюцца часам да страты прытомнасці [1, с. 62—63].

Безумоўна, такая сітуацыя вымушала мясцовую інтэлігенцыю і ўладу шукаць сродкі барацьбы са страшным злом. Вынікамі пошукаў з'явіліся распрацоўкі разнастайных метадаў барацьбы з п'янствам. Адным з іх сталі народныя чытанні. У 1876 г. выходзяць правілы арганізацыі народных чытанняў у губернскіх гарадах. Амаль праз 20 гадоў, у 1894 г., у Міністэрстве народнай асветы былі выпрацаваны агульныя правілы правядзення народных чытанняў па ўсёй імперыі, у тым ліку ў павятовых гарадах і вёсках. Іх арганізацыю кантралявалі прадстаўнікі духоўнага або вучэбнага ведамстваў. Сама назва гэтага віду дзейнасці раскрывала яго задачы, а яе змест вынікаў са спісаў літаратуры, якую дазвалялася чытаць наведвальнікам. Першапачатковы спіс складаўся з 287 назваў, у асноўным маральна-рэлігійнай літаратуры і белетрыстыкі. У хуткім часе спіс быў павялічаны да 712 кніг [1, с. 61]. Аднак заўважым, што ўрад не выдзяляў сродкі на арганізацыю чытанняў і кантроль за імі; справа была аддадзена на водкуп мясцовым уладам і добраахвотнікам. Таму народныя чытанні існавалі толькі на сродкі членаў таварыства, ахвяраванні і зборы з наведвальнікаў.

У той жа час улада, нават паліцыя, ускладала вялікія надзеі на народныя чытанні, спадзяючыся з іх дапамогай вырашыць задачу павышэння культурнага ўзроўню народа і праблему п'янства. Энтузіязм на месцах быў прыметным. Напрыклад, у снежні 1872 г. веліжскі павятовы спраўнік прасіў дазвол у віцебскага губернатара на арганізацыю народных чытанняў. Аднак у просьбе было адмоўлена па прычыне неабходнасці выканання непасрэдных службовых абавязкаў, бо "арганізацыя культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў дрэнна адаб'ецца на якасці нясення дзяржаўнай службы" [1, с. 62].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, улады толькі дэманстравалі пэўную зацікаўленасць у пашырэнні асветы, аднак на справе ўхіляліся ад падтрымкі гэтай важнай работы. Першыя народныя чытанні ў Беларусі адбыліся ў 1877 г. на Міншчыне. Відавочна, што значных дасягненняў чакаць было нельга, бо энтузіязму добраахвотнікаў хапіла не на доўга.

Наступны этап развіцця народных чытанняў звязаны з дзейнасцю Таварыства папячыцельства аб народнай цвярозасці, якое было створана ў 1894 г., а яго філіялы ў Беларусі пачалі дзейнічаць адначасова з увядзеннем у ліпені 1897 г. казённага продажу алкагольных напояў. Таварыства з'яўлялася добраахвотнай арганізацыяй, а асноўнымі формамі яго дзейнасці былі народныя чытанні і народны тэатр. Яны разглядаліся ўладай як галоўныя сродкі распаўсюджання сярод народа высокіх духоўных каштоўнасцей. У той жа час лічылася, што на арганізацыю народных чытанняў значныя сродкі не патрэбны па той прычыне, што памяшканне і чалавека, які б умеў выразна чытаць, можна знайсці без вялікіх затрат.

Аднак мясцовая інтэлігенцыя не так прамалінейна ставілася да культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва. Значная роля ў яе арганізацыі належала настаўнікам, святарам, урачам і інш. Яны прыўносілі ў асветніцтва сваё разуменне яго мэт і задач, укладалі ў яго арганізацыю не толькі асабістыя сродкі, але і душу.

У 1867 г. узнікла Таварыства мінскіх урачоў, якое, акрамя медыцынскіх праблем, займалася культурна-асветніцкай работай сярод насельніцтва. Праз некаторы час падобныя таварыствы былі арганізаваны ў Віцебску і Магілёве. У сярэдзіне 90-х гг. было створана Ваенна-санітарнае таварыства, якое ажыццяўляла асветніцкую работу ў воінскіх часцях. Праўда, у канцы дзесяцігоддзя яно перастала існаваць. У 1899 г. у Мінску пачало

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічаць Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Некаторыя асобы з'яўляліся адначасова актыўнымі сябрамі ўсіх трох аб'яднанняў, як, напрыклад, урачы П.А.Грацыянаў, С.Д.Камінскі, А.С.Касухін і інш. Пры таварыствах існавалі камісіі народных чытанняў, якія працавалі на добраахвотнай аснове. Камісія Таварыства ўрачоў пачала дзейнічаць у 1899 г. і ў першы год правяла 13 чытанняў, у наступныя гады іх колькасць узрасла да 19, нават да 24 за сезон. Тэматыка лекцый была разнастайнай, аднак у слухачоў—рамеснікаў, прыказчыкаў, навучэнцаў — найбольшай папулярнасцю карысталіся лекцыі на медыцынскія і прыродазнаўчыя тэмы. Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў арганізоўвала бясплатныя спектаклі, народныя чытанні, папулярныя лекцыі, мастацкія выставы, музычныя вечары. Дарэчы, на працягу 90-х гг. XIX ст. у Мінску актыўна дзейнічаў музычны гурток (у ім былі хор і аркестр), які гастраляваў па ўсёй Беларусі [2, с. 32—33].

Яшчэ адным кірункам пашырэння асветніцтва сталі народныя бібліятэкі і чытальні. Яны адчыняліся дзякуючы ініцыятыве сельскіх настаўнікаў, прыходскіх святароў. Праўда, працэс іх стварэння суправаджаўся вялікімі цяжкасцямі, таму што спачатку патрабаваўся дазвол Міністэрства ўнутраных спраў. Толькі ў 1890 г. былі зацверджаны новыя правілы работы бясплатных народных бібліятэк, згодна з якімі дазвол на іх адкрыццё даваў губернатар. Цікава, што ўрад зноў жа планаваў ускласці рашэнне праблемы на будучых чытачоў. У адпаведнасці з распрацаваным планам у валасцях павінны былі праходзіць сялянскія сходы з мэтай выдзялення сродкаў на бібліятэкі. Матэрыяльнымі сродкамі дапамагалі аддзяленні папячыцельства аб народнай цвярозасці і некаторыя памешчыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчыкі гэтай праблемы прыводзяць факты адкрыцця народных бібліятэк і чытальняў у многіх мясцовасцях Беларусі. Напрыклад, з 1892 г. у Пружанскім павеце такія асветніцкія ўстановы былі адчынены пры 27 народных вучылішчах [3]. Іх работа знаходзілася пад патранажам мясцовых святароў, што забяспечвала адносную абарону ад умяшання ўлад.

Да пашырэння асветы сярод насельніцтва прычыніліся і так званыя паўлянкоўскія бібліятэкі. Нагадаем, што перад сваёй канчынай у 1900 г. вядомы кнігавыдавец Ф.Ф.Паўляпкоў завяшчаў значную частку сваіх сродкаў (100 000 руб.) на стварэнне народных бібліятэк-чытальняў у найбольш бедных вёсках і мястэчках. Праз дзесяць гадоў пасля яго смерці ў Беларусі было арганізавана 11 бібліятэк: 9 — у Гродзенскай, пераважна ў Брэсцкім і Бельскім паветах, і 2 — у Мінскай губернях. Найбольш вядомая з іх бібліятэка імя Ф.Ф.Паўлянкова ў вёсцы Астрамечава Брэсцкага павета. У верасні 1906 г. у другім нумары газета «Наша доля» змясціла заметку «Аб паўлянкоўскіх бібліятэках». У ёй гаварылася: «Просяць нас паведаміць чытачоў, што цяперака адкрылася бібліятэка імя Ф.Ф.Паўлянкова у в. Астрамечава Брэсцкага павета Гродзенскай губерні». Газета тлумачыла, што народная бібліятэка можа быць закладзена толькі са згоды сельскай грамады, якая выдзяляе памяшканне і выбірае загадчыка, і пры ўмове ахвяраванняў на агульную суму не менш за 50 руб. На такую ж суму фонд Ф.Ф.Паўлянкова выслаў кніжкі, а таксама статут бібліятэкі.

Выклікае цікавасць відавочны факт узнікнення большасці паўлянкоўскіх бібліятэк у названых вышэй паветах. На нашу думку, адна з галоўных прычын гэтай з'явы ў тым, што ў справе стварэння Астрамечаўскай і іншых паўлянкоўскіх бібліятэк актыўна ўдзельнічалі студэнты-беларусы, якія ўваходзілі ў Беларускі навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратурны гурток пры Пецярбургскім універсітэце. Даследчыкі называюць прозвішчы М. і С.Раманскіх, С.Басякова і інш.

Што тычыцца непасрэдна Астрамечаўскай бібліятэкі, то, апроч кніг з фонду Ф.Ф.Паўлянкова, яна атрымала дапамогу грашыма і кнігамі ад аднаго таварыства з Францыі, ад Максіма Горкага, Льва Талстога, Янкі Купалы, ад святара Р.Пятрова, рэдакцыі «Нашай нівы» і інш. У 1907 г. у ёй было ўжо 1039 кніжак, якімі карысталіся сяляне з навакольных вёсак. Паўлянкоўскія бібліятэкі не былі кінуты на волю лёсу і пазней. Фонд Ф.Ф.Паўлянкова высылаў кніжкі і ў працэсе далейшай дзейнасці бібліятэкі.

Разам з тым аналіз шматлікіх паведамленняў з месцаў, якія друкаваліся ў «Нашай ніве», выразна адлюстроўвае непаслядоўнасць паведамленняў. Аўтары нярэдка пярэчаць адзін аднаму, а можа, і самі сабе, бо ўсе яны хаваюцца пад псеўданімамі. У нумары за 21 кастрычніка 1908 г. аўтар заметкі піша аб поспехах Астрамечаўскай бібліятэкі і актыўным наведванні яе мужыкамі з навакольных вёсак — Лышчыц, Кашылава, Баяр, Марозавіч, называе лічбу 220 чытачоў, кожны з якіх прачытаў па 15 кніжак. У гэтым жа нумары на другой старонцы паведамляецца, што «у нас ёсць бібліятэка-чытальня, але мала да яе людзей ходзіць, бо яны, відаць, лепей любяць піць гарэлку. Грошы не даюць мужыкі на бібліятэку...»

Сялянства разглядала народныя бібліятэкі не толькі як асяродак культуры, а перш за ўсё як цэнтр асветы. Вакол іх віравала жыццё, актыўнымі ўдзельнікамі і тлумачальнікамі якога з'яўляліся загадчыкі бібліятэк. Калі ўлічыць зацікаўленасць насельніцтва ў пераменах, зусім не здзіўляе жаданне выбіраць на пасады бібліятэкараў людзей, якіх яно лічыла карыснымі ў гэтай справе. Улада, са свайго боку не хацела пакінуць без кантролю гэты адзіны асяродак асветы, створаны па ініцыятыве знізу, і

актыўна ўмешвалася ў дзейнасць народных бібліятэк нават на ўзроўні губернатара. Напрыклад, па яго рашэнні чыноўнік па асобых даручэннях зрабіў рэвізію Астрамечаўскай бібліятэкі, і пасля яе ў бібліятэку перасталі прыходзіць газеты «Наша ніва» і «Северо-Западный голос».

Неабходна адзначыць, што вельмі многія з мясцовых памешчыкаў не толькі разумелі небходнасць пашырэння асветы сярод насельніцтва, але актыўна дзейнічалі ў гэтым кірунку. Аб адным з іх, А.Ельскім, уладальніку маёнтка Замосце ў Ігуменскім павеце, яго сучаснік пісаў, што ён "нашаму грамадству і Літвы і Русі служыць узорам не толькі працы, але і глыбокага спасціжэння духу народа і яго маральных і разумовых патрэб" [3, с. 8]. Для такой высокай ацэнкі асветніцкай дзейнасці А.Ельскага былі ўсе падставы. Будучы вучоным і патрыётам свайго краю, ён актыўна супрацоўнічаў з 20 перыядычнымі выданнямі. Напрыклад, амаль у кожным нумары пецярбургскага часопіса "Край" змяшчаліся карэспандэнцыі з Замосця пад Мінскам, у якіх закраналіся праблемы выхавання і маралі, паведамляліся навіны грамадскага і культурнага жыцця Міншчыны. Аляксандр Ельскі ўзначальваў павятовы рух за цвярозасць. У 1900 г. у Санкт-Пецярбургу выйшла яго кніжка "Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п'яніцы. Добраму беларускаму народу на падмацаванне яго душы і розуму" [3, с. 58].

Многія з прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі і памешчыкаў бачылі задачу асветніцтва ў рашэнні надзённых праблем, самай галоўнай з іх, безумоўна, з'яўлялася зямельнае пытанне. Некаторыя з іх, напрыклад член Дзяржаўнай думы, уладальнік маёнтка Парэчча на Піншчыне Р.Скірмунт, лічылі неабходным развіваць у народа пачуццё павагі да прыватнай уласнасці на зямлю. Фактычна блізкую пазіцыю займаў вядомы даследчык беларускай культуры Е.Р.Раманаў. На пасадзе рэдактара не-

афіцыйнага аддзела "Магілёўскіх губернскіх ведамасцей", якую ён займаў шэсць гадоў, вучоны актыўна праводзіў думку аб неабходнасці асветы сярод сялянства, паляпшэнні дзейнасці Сялянскага банка, пашырэнні крэдытных аперацый і інш. [5, с. 28].

Безумоўна, характарыстыку разнастайнай асветніцкай дзейнасці на памежжы стагоддзяў можна прадаўжаць, аднак пэўныя яе заканамернасці, на наш погляд, магчыма вызначыць і на падставе прыведзенага вышэй фактагічнага матэрыялу. Па-першае, у яе ажыццяўленні прымалі ўдзел самыя розныя колы насельніцтва — ад настаўнікаў і прыходскіх святароў як прадстаўнікоў ніжэйшай праслойкі інтэлігенцыі да вядомых вучоных і ўплывовых мясцовых памешчыкаў. Па-другое, дзяржава таксама была зацікаўлена ў распаўсюджванні асветы, праўда, большай часткай за кошт мясцовай ініцыятывы, але пэўныя арганізацыйныя крокі і ідэі з яе боку аказаліся станоўчымі. Па-трэцяе, формы і метады асветы былі досыць разнастайнымі: ад народных чытанняў да стварэння бібліятэк і чытальняў; ад народных тэатраў пры чайных да аматарскіх публічных спектакляў мясцовай інтэлігенцыі. Па-чацвёртае, усё адзначанае вышэй садзейнічала пашырэнню асветы сярод насельніцтва і адлюстроўвала разнастайнасць культурна-асветніцкага жыцця ў беларускім грамадстве на памежжы стагоддзяў.

1. *Багдановіч А.І.* Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі (1861—1900 гг.): Дыс. … канд. гіст. навук / БДПУ. — Мн., 2003. — 103 с.

2. *Бяспалая М.* З гісторыі народнай асветы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1987. — № 2. — С. 32—33.

3. *Дзеля* блізкіх і прышласці: Матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. "Універсітэты Ельскіх" (да 165-годдзя з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дня нараджэння А.Ельскага), Мінск, 7 кастрычніка 1999 г. / Бел. ун-т культуры. — Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. — 156 с.

4. *Кісялёва В.* Бібліятэкі імя Ф.Ф.Паўлянкова // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1985. — № 1. — С. 36.

5. *Пічукоў В.* Прагрэсіўны рэдактар // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1985. — № 3. — С. 26—28.

**О.О.Грачева,**
*доцент*

## МАДОННА КАК УНИВЕРСАЛЬНЫЙ ОБРАЗ МАТЕРИНСТВА В ИСКУССТВЕ

Образ матери — один из главных образов искусства, который во многом определяет эстетические вкусы и пристрастия человека. Архетипический образ материнства формируется в сознании каждого человека в процессе приобщения его к сокровищам мировой художественной культуры.

Появление потомства — важнейшее событие в жизни любого земного существа. Вероятно, акт рождения ребенка был одним из первых событий, осмысленных человеком и закрепленных в его сознании. Формы этого закрепления имели мифологический характер. Образ матери стал таким архетипическим мифологизированным образом.

К.Г.Юнг понимает архетип матери широко и усматривает его в образе собственной матери или бабушки, а также кормилицы или воспитательницы. Она является “в высоком, переносном смысле богиней, особенно Божьей Матерью, девой, Софией... в более широком смысле — церковью, городом, небом, морем; в более узком смысле, как

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ